# § 53. Разнастайнасць млекакормячых: першазвяры і звяры. Сумчатыя і насякомаедныя

**Успомніце:** Які спосаб развіцця — жыванараджэнне або адкладванне яец — з'яўляецца больш прагрэсіўным і чаму?

Млекакормячых падзяляюць на два ***падкласы***: ***Першазвяры*** (яйцародныя) і ***Звяры*** (жыванародныя).

Прадстаўнікі ***падкласа Першазвяры*** — гэта найбольш прымітыўная і старажытная група сучасных млекакормячых. У адрозненне ад іншых млекакормячых, у іх ёсць клаака і размнажаюцца яны адкладваючы яйцы. У першазвяроў адсутнічаюць саскі, пратокі малочных залоз адкрываюцца на паверхню скуры. Малако дзіцяняты злізваюць з шэрсці самкі, бо ў іх адсутнічаюць губы. Да першазвяроў належаць *качканос* і *яхідна* (мал. 184). Гэтыя жывёлы насяляюць Аўстралію і прылеглыя астравы.

*Качканос* (мал. 184) жыве на сушы, а корміцца ў вадзе. Яго прысадзістае цела пакрыта кароткай мяккай шэрсцю бурага колеру. Пальцы задніх канечнасцей злучаны плавальнай перапонкай, хвост плоскі. З дапамогай шырокай «дзюбы» качканос, як качка, працэджвае ваду, здабываючы для пракорму беспазваночных жывёл. Вушных ракавін у качканоса няма, а слыхавыя праходы адкрываюцца на паверхні галавы. У самкі, як і ў птушак, развіты адзін яечнік, матка адсутнічае. Маленькія качканосы вылупліваюцца з яец голымі, сляпымі і бездапаможнымі.

*Яхідна* — наземнае млекакормячае, рые хованкі. Яе цела пакрыта жорсткімі валасамі і вострымі іголкамі (мал. 184). Канечнасці забяспечаны доўгімі кіпцюрамі. З дапамогай доўгага і ліпкага языка яхідна ловіць насякомых. Самка адкладвае адно яйцо, якое носіць у вывадкавай сумцы на бруху. Дзіцяня



Качканос



Яхідна

**Мал. 184.** Яйцародныя млекакормячыя

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

застаецца каля маці ў сумцы, пакуль на яго целе не пачнуць расці вострыя іголкі.

Пераважная большасць відаў млекакормячых належыць да ***падкласа Звяры***. Пазнаёмімся з некаторымі з іх.

**Сумчатыя млекакормячыя.** Прадстаўнікі сумчатых — *каала*, *кенгуру* (мал. 185) — з'яўляюцца раслінаеднымі. У іх адсутнічае або слаба развіта плацэнта. Народжаных дзіцянят самка доўгі час выношвае ў вывадкавай сумцы на бруху. Каала і кенгуру насяляюць Аўстралію і прылеглыя астравы.



Каала



Кенгуру

**Мал. 185.** Сумчатыя млекакормячыя

*Кенгуру гіганцкі* дасягае вышыні 2 м, перамяшчаецца вялікімі скачкамі з дапамогай моцных задніх канечнасцей з хуткасцю да 60 км/г. Магутны хвост служыць балансірам пры скачках і апорай падчас адпачынку. Корміцца раслінамі.

***Атрад Насякомаедныя*** аб'ядноўвае дробных і сярэдніх жывёл, пакрытых кароткай мяккай шэрсцю, у некаторых ёсць іголкі. У большасці насякомаедных нос выцягнуты ў рухомы хабаток. Вушныя ракавіны маленькія або адсутнічаюць. Вочы невялікія ці недаразвітыя. Зубы слаба дыферэнцыраваны. Кара вялікіх паўшар'яў пазбаўлена звілін.

Тэрыторыю нашай краіны насяляе больш за 10 відаў насякомаедных, сярод іх *буразубка звычайная*, *крот звычайны* (мал. 186), *вожык звычайны* (мал. ф-33).

*Буразубка звычайная* (мал. 186) з'яўляецца прадстаўніком дробных млекакормячых — землярыек, што жывуць у глебе. Знешне падобна на мыш, але адрозніваецца носам, выцягнутым у рухомы хабаток. Буразубка хутка бегае. Яна пражэрлівая: з'ядае за суткі ў 1,5–4 разы больш



Буразубка звычайная



Крот звычайны

**Мал. 186.** Прадстаўнікі насякомаедных

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

за масу свайго цела. Буразубкі прыносяць карысць, знішчаючы насякомых-шкоднікаў.

*Крот звычайны* (мал. 186) мае кампактнае цыліндрычнай формы цела з дрэнна выяўленай шыяй. Вочы недаразвітыя, вушныя ракавіны адсутнічаюць. Дзякуючы пярэднім канечнасцям, прыстасаваным для капання, крот хутка перамяшчаецца ў глебе. Корміцца дажджавымі чарвямі, насякомымі і іх лічынкамі, якіх знаходзіць дзякуючы добраму нюху.

*Вожык звычайны* (мал. ф-33) вядзе прыцемкавы і начны спосаб жыцця. Спіна жывёлы пакрыта іголкамі — відазмененымі валасамі. Вожык — пражэрлівая істота. Акрамя насякомых, корміцца беспазваночнымі і дробнымі пазваночнымі жывёламі (яшчаркамі, жабамі, мышамі). Жыве ў лясах, але нярэдка пасяляецца побач з чалавекам. Пры небяспецы скручваецца клубком.

**Паўторым галоўнае.** Млекакормячых падзяляюць на два падкласы: Першазвяры (яйцародныя) і Звяры (жывародныя). Пераважная колькасць відаў млекакормячых — жывародныя. Першазвяры не нараджаюць дзіцянят, а адкладваюць яйцы. Сумчатыя млекакормячыя адрозніваюцца слабаразвітой плацэнтай і даношваюць дзіцянят у сумцы на бруху. У насякомаедных нос выцягнуты ў рухомы хабаток. Зубы слаба дыферэнцыраваны. Кара вялікіх паўшар'яў пярэдняга мозга пазбаўлена звілін.

**Пытанні і заданні.** **1.** Чым адрозніваюцца качканос і яхідна ад іншых млекакормячых? **2.** Назавіце асаблівасці сумчатых жывёл. **3.** Якія агульныя рысы будовы маюць яйцародныя млекакормячыя і птушкі? **4.** Чаму зімой буразубка і крот працягваюць актыўную дзейнасць, а вожык упадае ў спячку?

## § 54. Рукакрылыя і грызуны

**Успомніце:** **1.** Якіх лятучых жывёл вы ведаеце? **2.** Якія прыстасаванні да палёту маюць лятучыя жывёлы?

***Атрад Рукакрылыя.*** Прадстаўнікі — *кажаны*, *крыланы* і іншыя жывёлы. Рукакрылыя прыстасаваліся да актыўнага палёту. Лятаюць яны дзякуючы эластычнай скурыстай перапонцы, нацягнутай паміж падоўжанымі пальцамі пярэдніх канечнасцей, бакамі цела, заднімі

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Вушан звычайны Вячэрніца рыжая Начніца сажалкавая

**Мал. 187.** Рукакрылыя Беларусі

канечнасцямі і хвастом. У палёце перапонка нацягваецца, павялічваючы плошчу лятальнай паверхні. Грудзіна мае кіль, да якога мацуюцца моцныя грудныя мышцы.

Найбольшую актыўнасць рукакрылыя праяўляюць у прыцемкі і ў начны час. Яны арыентуюцца ў паветранай прасторы з дапамогай *рэхалакацыі*. У палёце рукакрылыя перадаюць ультрагукавыя сігналы (чалавечае вуха іх не ўспрымае). Гэтыя сігналы далятаюць да аб’ектаў і, адбіваючыся ад іх, успрымаюцца чулым слыхам рукакрылых. Такім чынам жывёлы вызначаюць месцазнаходжанне аб’ектаў, адлегласць да іх, што дапамагае ім лятаць у цемры і паляваць.

У нашай краіне сустракаецца каля 20 відаў рукакрылых: *вушан звычайны*, *вячэрніца рыжая (рудая)*, *начніца сажалкавая* (мал. 187) і інш. Усе яны днём спяць у зацішных месцах, учапіўшыся заднімі канечнасцямі і звесіўшы ўніз галаву. Самка звычайна нараджае адно дзіцяня, голае і сляпое. Дзіцяня моцна трымаецца кіпцікамі за шэрсць маці і не адчэпліваецца нават, калі маці палюе.

*Начніца сажалкавая* (мал. 187), *шыракавушка еўрапейская* ўключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

***Атрад Грызуны*** — самая шматлікая па відавым складзе група млекакормячых. Гэта *тушканчыкі*, *хамякі*, *ваверкі*, *суслікі*, *пацукі*, *мышы*, *палёўкі*, *бабры* і інш. Разцы ў грызуноў растуць на працягу ўсяго жыцця, таму яны павінны іх пастаянна сточваць. Часткі раслін жывёлы адгрызаюць разцамі, а потым пераціраюць карэннымі зубамі (іклы адсутнічаюць). Грызуны — важнае звяно ў ланцугах харчавання. Сярод іх сустракаюцца шкоднікі сельскагаспадарчых культур (мышы, палёўкі) і пераносчыкі інфекцыйных захворванняў чалавека і свойскіх жывёл (мышы, пацукі). Некаторыя грызуны (бабры, ваверкі) з’яўляюцца аб’ектамі пушнога промыслу.

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»



Бабёр рачны Пацук шэры Вавёрка звычайная Соня садовая

**Мал. 188.** Прадстаўнікі грызуноў

*Бабёр рачны* (мал. 188) — самы буйны грызун, які насяляе тэрыторыю нашай краіны. Афарбоўка шэрсці бывае ад светла-бурай да чорнай. Тулава ў бабра мехаватае, бруха адвіслае. Вялікая галава заканчваецца тупой пысай; добра заўважна пара буйных разцоў аранжавага колеру. Вушныя ракавіны і ноздры пабудаваны так, што абараняюць слыхавы праход і дыхальныя хады ад пранікнення вады пры ныранні. Масіўны плоскі хвост пакрыты рагавымі шчыткамі, якія нагадваюць луску. У аснове хваста знаходзяцца залозы, сакрэтам якіх бабёр змазвае шэрсць, пасля чаго яна робіцца непрамакальнай. Палавы дымарфізм у баброў выяўлены слаба (самкі трохі буйнейшыя за самцоў).

Бабры добра плаваюць у вадзе, а па зямлі перамяшчаюцца марудна. Летам значны час бавяць у сваім жыллі (норах або хатках), уваход у якое заўсёды робяць пад вадой. Зімой бабры могуць не паказвацца на паверхні вадаёма некалькі месяцаў. У месцах свайго пражывання яны падтрымліваюць пэўны ўзровень вады, для чаго з галінак, камянёў і гліны будуюць запруды (плаціны).

*Пацук шэры* (мал. 188) жыве паўсюдна, акрамя палярных абласцей і пустыняў. Добра развітыя канечнасці з вострымі маленькімі кіпцікамі дазваляюць жывёле хутка бегаць, лазіць, скакаць і нават плаваць.

Пацукі — сінантропныя жывёлы: пасяляюцца ў жылых і нежылых будынках. Летам з будынкаў перабіраюцца на пусткі і ў агароды, паркі і сады. Пацукі — усёедныя. Вядуць пераважна прыцемкавы спосаб жыцця, але пры вялікай колькасці могуць быць актыўныя і днём. Гэта зласлівыя і агрэсіўныя жывёлы.

*Вавёрка звычайная* (мал. 188) шырока распаўсюджана ў лясах Беларусі. Гэта рыжы спрытны звярок з выцягнутым зграбным целам і пухнатым хвастом. У вавёркі вялікія, у параўнанні з галавой, чорныя вочкі і доўгія вушкі, на канцы якіх, асабліва зімой, добра

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

заўважны пучкі валасоў. Большую частку жыцця звярок праводзіць на дрэвах. Корміцца насеннем іглічных дрэў, арэхамі і жалудамі, пупышкамі раслін, ягадамі і грыбамі, насякомымі. Жыллё стварае ў дупле або ў гняздзе. На зіму назапашвае корм. Вавёркі спрыяюць распаўсюджванню насення дрэвавых раслін, спораў грыбоў, знішчаюць насякомых — шкоднікаў лесу і іх лічынкі.

*Соня садовая* (мал. 188 на с. 209) уключана ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

**Паўторым галоўнае.** Рукакрылыя млекакормячыя прыстасаваліся да актыўнага палёту: у іх есць эластычная скурыстая перапонка. Грудзіна забяспечана кілем. Разцы грызуноў растуць на працягу ўсяго жыцця. Некаторыя грызуны з'яўляюцца шкоднікамі сельскагаспадарчых раслін і пераносчыкамі інфекцыйных захворванняў чалавека і свойскіх жывёл. Бабры, вавёркі — аб'екты пушнога промыслу.

**Пытанні і заданні.** **1.** Якія асаблівасці будовы дазваляюць рукакрылым лятаць? **2.** Якім чынам рукакрылыя арыентуюцца ў палёце? **3.** Пералічыце агульныя рысы будовы грызуноў. **4.** Якія прыстасаванні ёсць у бабра для жыцця ў вадзе? **5.** Якую ролю ў прыродзе выконваюць грызуны? Раскажыце пра іх значэнне ў жыцці чалавека.

## § 55. Драпежнікі, ластаногія і кітападобныя

**Успомніце:** **1.** Як дыферэнцыраваны зубы ў сабакі свойскага? **2.** Якія прыстасаванні ёсць у млекакормячых для жыцця ў водным асяроддзі?

***Атрад Драпежныя.*** Ва ўсіх драпежных добра развіты іклы, якімі жывёлы захопліваюць здабычу і ўтрымліваюць яе. Акрамя таго, ёсць чатыры карэнныя зубы, відазмененыя ў моцныя «драпежныя» зубы. Імі жывёлы адрываюць кавалкі мяса і могуць драбніць косці.

*Мядзведзь буры* (мал. 189) уключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Гэта самае буйное драпежнае млекакормячае нашай краіны. Маса цела можа дасягаць больш як 300 кг. Нягледзячы на непаваротлівы знешні выгляд, мядзведзь здольны хутка рухацца. Звычайна селіцца ў глухіх мясцінах лесу. Вядзе аселы спосаб жыцця, але можа рабіць невялікія міграцыі ў пошуках корму. Здабычай драпежніка становяцца дробныя і буйныя пазваночныя жывёлы, а таксама

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»